**УДК 94 (438 + 476): 930**

# ТАЛЕРЫ Ў ГРАШОВЫМ АБАРАЧЭННІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ДА ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ

***А.В. КАРАЧ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэта імя Янкі Купалы)***

*Вызначаецца роля самай вялікай срэбранай манеты ў грашовым абарачэнні на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага да канца 60-х гг. XVI ст. Удакладняюцца звесткі аб першай згадцы талера ў мясцовых крыніцах. Адзначаецца, што па розных прычынах талеру было складана заняць сваю нішу на фінансавых рынках ВКЛ. Падрабязна разглядаюцца пытанні эмісій першых літоўскіх талераў, асаблівасцей саміх манет і іх характарыстык.*

***Ключавыя словы****: ВКЛ, талер, грош, манета, Жыгімонт Аўгуст, грашовае абарачэнне, скарб.*

Шэраг аспектаў грашовага абарачэння мінулага і на сённяшні момант з’яўляюцца дастаткова актуальнымі. Па-гэтаму існуе неабходнасць вывучэння папярэдняга вопыта ў гэтай сферы. Вывучэнне ролі і месца талера ў грашовым абарачэнні ВКЛ да канца 60-х гг. XVI ст. і пытанні літоўскіх эмісій талераў часоў Жыгімонта Аўгуста дагэтуль не былі шырока разгледжаны ні ў айчыннай, ні ў замежнай гістарычнай навуцы. Некаторыя аспекты ролі талераў і іх эмісій былі закрануты ў працах У. Уланіцкага [1], М. Гумоўскага [2], В.Н. Рабцэвіча [3], Э. Іванаускаса [4] і Ш.І. Бекцінеева [5].

Першая манета, якую прынята называць талерам, была выпушчана ў 1484 г. на Цірольскім манетным двары ў Халле эрцгерцагам Сігізмундам. У 1518 г. у чэшскім горадзе Іахімсталь пачалі біць манету, за якой з сярэдзіны 20-х гг. XVI ст. замацавалася назва “іахімсталер”, пазней скарочаная назва – “талер” [Фенглер, с. 271].

Выдатнейшы беларускі нумізмат, доктар гістарычных навук, прафесар В.Н. Рабцэвіч, у сваёй працы “Нумізматыка Беларусі”, згадваючы талеры, піша: *Под 1529 г. белорусские источники впервые фиксируют талер в упомянутом выше завещании слонимского старосты Михала Боговитинова, где помимо различных денежных сбережений в серебряных и золотых монетах особо отмечены “чотыри талеры сребреных”. Совершенно очевидно, что специальное выделение этой сравнительно небольшой суммы и, более того, снабжение её поясняющим эпитетом “сребреные” не случайно: талер – ещё малоизвестная монета* [3, с. 170].

Патрэбен пэўны час, каб адпаведная лексіка распаўсюдзілася на суседнія землі, і новыя манеты ўключыліся ў грашовае абарачэнне. Настолькі ранняя згадка назвы манеты ў скарочаным выглядзе ў мясцовых крыніцах выглядае неверагодна. Тым больш, што наступны дакумент, вядомы В.Н. Рабцэвічу, у якім згадваюцца талеры, датаваны толькі 1557 г. – амаль праз 20 год пасля першай згадкі [3, с. 170]. Варта прывесці частку дакумента, на які спасылаецца В.Н. Рабцэвіч: *“…а рукомыи меншии сребреныи, а две мисе сребреных великихъ а третій полумисокъ сребреный, а чотыри талеры сребреныхъ…”* [7, с. 76]. Аналіз гэтага дакумента дазваляе з упэўненасцю сказаць, што сэнс слова “талеры” прачытаны няправільна. У дакуменце пералічваюцца сталовыя рэчы: рукамыйнік, місы, паўмісак і талеры. Слова “тале́ры” у дадзеным выпадку выступае ў якасці адзінкі посуду (талерка) і не мае ніякага дачынення да манеты з назвай талер.

Беларускі даследчык Ш.І. Бекцінееў першую згадку аб талерах (у адносінах да тэрыторыі сучаснай Беларусі) адносіць да 1555 г., аднак і гэта не верна [5, с. 256]. Верагодна, упершыню талер згадваецца пад 1546 г. менавіта як *“яхимъ талер”* [8, с. 21].

Такім чынам, талеры ў грашовым абарачэнні ВКЛ пачалі з’яўляцца толькі ў сярэдзіне 1540-х гг., а не раней ці пазней, як сцвярджалі В.Н. Рабцэвіч і Ш.І. Бекцінееў.

Вельмі цікавы эпізод, звязаны з манетарнай палітыкай у ВКЛ, меў месца ў 1564 г., калі на Тыкоцінскай мынцы рабіліся надчэканы на талеры і паўталеры Карла V і Філіпа II. Гэта гісторыя пачалася ў 1556 г. з ад’ездам у Італію каралевы Боны. З сабою яна ўзяла велізарныя багацці. Сведкай адпраўлення Боны быў тыкоцінскі староста, Лукаш Гурніцкі, які сцвярджаў, што караван складаўся з дваццаці чатырох шасціконных возаў [9, с. 507]. Праз некаторы час Бона пазычыла Філіпу II 430 000 дукатаў, але неўзабаве хутка памерла. Жыгімонт Аўгуст як нашчадак рабіў шматлікія спробы вярнуць пазычаныя грошы і іншыя каштоўнасці маці. Гэта атрымалася зрабіць толькі ў пачатку 1564 г.: іспанскі двор згадзіўся вярнуць частку грошай (гэта былі даходы ад мытных уладанняў, якія па тэстаменту і так належалі Вялікаму князю) у выглядзе талераў і паўталераў Філіпа II і паўталераў Карла V. Каб не губляць часу (трэба было хутка выплаціць грошы войску) на пераплаўку і наступныя эмісіі сваіх манет, было вырашана рабіць контрсігнатуры ў выглядзе перакрыжаваных лацінскіх літар “S A” – вензеля Жыгімонта Аўгуста і даты “1564” на рэверсе гэтых манет. Згодна з Кнышынскім універсалам ад 16 мая 1564 г., у аба-

рачэнне яны пускаліся па строга вызначаных коштах – талер раўняўся 60 польскім грошам, паўталер – 30 [10, с. 16]. Такі завышаны курс звёў у зман некаторых даследчыкаў, якія сцвярджалі аб існаванні падвойных талераў, якія ішлі па вышэйадзначанаму курсу ў 60 польскіх грошай [11, с. 67]. Манетам прыдаваўся крэдытны характар шляхам увядзення іх у абарачэнне па завышанаму курсу, бо неапалітанскі талер раўняўся толькі 33, 5 польскіх грошам, а паўталер – 16, 75. На такой аперацыі скарб краіны зарабіў дадатковыя грошы. Вядомы толькі два тыпа манет з сапраўдным надчэканам – талер і паўталер. Аднак М. Гумоўскі апісвае і чвэрць талера Філіпа II, спасылаючыся на збор А. Ёхера [2, с. 82]. Але на сённяшні момант такой манеты не вядома.

У Польшчы такія манеты называлі “неапалітанскі дукатон” [10, с. 127–128], а ў ВКЛ – “філіпок” [3, с. 162–163]. Апошняя назва ўзнікла з-за таго, што большасць манет была з выявай караля Іспаніі Філіпа II.

З уступленнем ВКЛ у Інфлянцкую вайну паступленні талераў павялічыліся, і 14 чэрвеня 1567 г. на Петркоўскім сейме паслы былі азнаёмлены з універсалам Жыгімонта Аўгуста. У гэтым дакуменце змяшчаліся выявы і апісанні 60 іншаземных талераў і іх кошты, па якіх яны маглі абменьвацца на мясцовыя грошы [12, с. 5–19].

Першыя літоўскія талеры былі выпушчаны ў часы Жыгімонта Аўгуста.

Т. Чацкі сцвярджаў, што яму вядомы справаздачы мынцы, у якіх адзначалася, што талеры пачалі біцца ў ВКЛ у 1551 г. Больш таго, ён сцвярджаў, што сам бачыў такую манету [13, с. 160]. Аднак на сённяшні момант такія дакументы не вядомы і сапраўднага літоўскага талера з датай 1551 няма ні ў водным зборы.

У 1564 г. вельмі абмежаваным накладам былі выпушчаны манеты, на якіх размяшчалася абазначэнне намінала – “ХХХ” грошай [14, с. 576–577]. Паўстае пытанне: якіх грошай – польскіх ці літоўскіх? Пазначаная вартасць складала палову капы, што і прадвызначыла іншую назву – “паўкопэк” [10, с. 13; 15, с. 199; 16, с. 28]. К. Строньчынскі ўжывае і другую назву – “златоўка” [13, с. 162–163]. Гэтая назва паходзіць ад тэрміна “злоты”, які раўняўся 30 польскім грошам [17, с. 79, 214]. Такім чынам, К. Строньчынскі сцвярджае аб намінале ў 30 польскіх грошай. А, напрыклад, у каталозе калекцыі Э. Гутэн-Чапскага – найбуйнейшым зборы польска-літоўскіх манет XIX ст. – вызначаецца курс гэтай манеты ў 37,5 польскіх грошай [18, с. 46]. Выходзіць, што намінал пазначаны ў літоўскіх грошах. Апошняя думка нам падаецца больш верагоднай.

Дызайн манеты выглядае цалкам незвычайным. На ёй няма ні надпісаў, ні выявы Вялікага князя: у цэнтры аверса размешчана манаграма Жыгімонта Аўгуста ў выглядзе перакрыжаваных літар “SA”, якая падзяляе дату “1564” на дзве часткі. Пад манаграмай пазначаны намінал у выглядзе трох лацінскіх лічбаў “XXX”. На рэверсе – шасціпольны герб: “Пагоня” (сімвал ВКЛ), Арол (Польшча), Міхал Архангел (Кіеўшчына), Крыж (Валынь). У цэнтры – герб Боны Сфорца ў выглядзе змея з дзіцём у пастцы. Такія характарыстыкі сведчаць аб тым, што гэты паўкопэк з’яўляецца прадуктам надзвычайных абставін, і яго эмісіі былі звязаны з неабходнасцю хуткага папаўнення скарбу краіны. Загорскі піша, што выпуск паўкопкаў быў звязаны з цяжкасцямі вядзення Інфлянцкай вайны [10, с. 13]. Аднак пры гэтым не спасылаецца ні на якія крыніцы. Магчыма на гэту думку яго схіліла аперацыя па контрмаркіраванню неапалітанскіх талераў і паўталераў Карла V і Філіпа II 1 1564 г., якія потым шлі ў абарачэнне па завышанаму кошту.

На самой манеце быў абазначаны курс талера ў літоўскіх грошах, аднак іншаземныя талеры мелі курс у 25 – 31 польскіх (ці 30 – 37 літоўскіх) грошай [12, с. 6–11]. Адсюль вынікае, што і гэтыя манеты мелі прымусовы курс, бо лотавая проба паўкопка 1564 г. была 12, а, напрыклад, неапалітанскія талеры (на якіх ставіліся літоўскія контрмаркі) былі нават вышэй 14-й лотавай пробы [1, с. 10]. Такім чынам, гэтую манету па сэнсу нельга атаясамляць з іахімталерам (талерам). Адсюль вынікае, што гэта манета надзвычайных абставін, эмісіі якой былі выкліканы велізарнымі праблемамі вялікакняскага скарбу: надаючы такой манеце пры выпуску завышаны намінал у 30 літоўскіх грошай, дзяржава жадала атрымліваць дадатковыя сродкі з эмісій.

Упершыню паўкопэк з датай “1565” быў апісаны ў 1766 г. у працы “Volstandiger Thaler-Cabinet” і пазначаны як “надзвычай рэдкі” [1, с. 14]. У 1856 г. адзіны знаны на той час паўкопэк 1565 г. быў куплены графам Уваравым у Вене ў вядомага мясцовага антыквара Обернадорфа за 15 000 (рублёў, марак ? – *А. К.*). Яго вага складала 24 гр., дыяметр – 39 мм., 14 лотавая проба [1, с. 5–6]. Праз некаторы час пасля смерці Уварава, яго жонка прадала гэтую манету графу Асалінскаму. Пазней манета патрапіла да пазнаньскага нумізмата М. Франкевіча, які ў 1930 г. прадаў рарытэт вядомаму калекцыянеру А. Рачкусу за 3 000 долараў ЗША. Другі вядомы экзэмпляр быў куплены тым самым А. Рачкусам у Мілане ў 1925 г. Да яго прымацавана вушка, відаць выкарыстоўваўся ў якасці медаля для нашэння [19, с. 86].

Першым, хто дакладна вывучаў талер 1565 г., быў У. Уланіцкі, які зрабіў з яго гальванакопію. У сярэдзіне аверса былі размешчаны ўкаранаваныя перакрыжаваныя літары “SA” і дата 1565. На рэверсе выява Жыгімонта Аўгуста. Вакол надпісаў і выяваў з двух бакоў лаўровы вянок. Гэты паўкопэк сты-

лістычна адрозніваўся ад такой самай манеты з папярэдняга года – замест шасціпольнага герба з'явілася выява Вялікага князя. Але сама выява была непадобна на іншыя выявы Жыгімонта Аўгуста на манетах, што адразу ж нарадзіла пытанні аб аўтэнтычнасці. Таксама лічба "XXX" была заменена на спрошчаны варыянт "30". Аднак больш дасканалы аналіз падцвердзіў, што гэта не падробка, а арыгінал надзвычай рэдкай манеты. Да таго ж высновы прыйшоў і Ул. Бартыноўскі [20, с. 68–69].

Адначасова з гэтым, з-за прымусовага курсу вышэйадзначаных манет, павялічыўся наплыў у краіну еўрапейскіх талераў, якія мелі рознае ўтрыманне срэбра ў сваім складзе. Гэта вымусіла кіраўніцтва краіны ісці на спецыяльныя мерапрыемствы. У 25 раздзеле канстытуцыі Петракоўскага сейма 1567 г. гаворыцца пра наплыў "злых і неважных талераў" і вялікую шкоду, якая паходзіць з-за гэтага [21, s. 69]. З-за таго, што новыя талеры менш паўнавартасныя за папярэднія паступленні, узнікла неабходнасць у вызначэнні коштаў новых манет. Адказам на гэта з'явілася новая пастанова ад 4 верасня 1567 г., згодна якой, усе талеры падзяляюцца на *"старие зуполное ваги"* і *"новые, которие ваги зуполное в собе не мають"*. З-за гэтага *"не малая шкода в скарбе нашомъ и межи всими станы вобець деєть"*. Быў устаноўлены цвёрды курс, па якому розныя талеры павінны разменьвацца на мясцовыя грошы: "старыя" талеры – па 33 польскіх гроша (39, 6 літоўскіх), а "новыя" – па 30 грошай і 4 пенязя (36, 5 літоўскіх) [22, с. 699–700]. Пад "старымі" талерамі меліся на ўвазе гульдэн-грошы, якія біліся ў Свяшчэннай Рымскай імперыі згодна ардынацый ад 1524 і 1551 гг. "Чыстая вага" срэбра ў такіх манетах павінна была складаць 27, 41 гр. "Новыя" талеры біліся пасля ардынацый 1566 г. з вызначанай "чыстай вагой" у 25, 28 гр. [4, с. 59].

Несумненна, што гэтыя меры з'яўляюцца вынікам той непрадбачнай фінансава-грашовай палітыкай кіраўніцтва ВКЛ у 1564 г.

Э. Іванаускас выказвае іншую версію, што гэтыя манеты трэба лічыць польскімі златовікамі, вартасцю ў 30 польскіх грошай, а не літоўскіх. Гэты тэзіс ён падмацоўвае вылічэннем каштоўнага метала ў складзе манеты, параўнаннем з іншымі талеравымі манетамі і неабходнасцю выплатаў наймітам-палякам менавіта ў польскай манеце. Э. Іванаускас называе талер мясцовым разнавідам імперскага рэйхсгульдзінера [4, с. 59–60]. Аднак аўтэнтычных талераў 1564 гг. вядомы лічаныя экзэмпляры. У такім выпадку застаецца незразумелым, чаму эмісіі польскіх 30-грашовікаў абмежаваліся толькі пробнай партыяй, бо, калі б планаваліся разлікі з вайскоўцамі, то колькасць выпушчаных экзэмпляраў была б значна большай нават на першапачатковым этапе эмісій.

Яшчэ адна загадка – гэта літоўскі паўталер з датай 1564. Ён адрозніваецца ад талера з гэтага года толькі памерам, вагой і лічбай, якая азначае намінал – "XV". Адзіны экзэмпляр такой манеты захоўваецца ў Музеі гісторыі мастацтваў у Вене [23, с. 129, 142]. Ніякіх дакументаў, у якіх бы згадваўся літоўскі паўталер няма (ці не захавалася). У XIX ст. з'явілася некалькі розных варыянтаў паўталераў, аднак усе яны былі прызнаны падробкамі, а толькі адзін арыгіналам [15, с. 195–197]. Складальнік каталогаў манет ВКЛ Э. Іванаускас не ўключыў паўталер 1564 г. у свае апошнія працы [24; 14], хаця раней прызнаваў аўтэнтычнасць гэтай манеты [23, с. 129]. Нам падаецца, што сэнсу ў выпуску такога намінала, як паўкопэк рэальна не было, і ўсе 15 грашовікі Жыгімонта Аўгуста з'яўляюцца прадуктам працы фальшароў XIX ст.

Невядома, калі літоўскія талеры планавалася выпусціць у абарачэнне, – ніякіх архіўных дакументаў аб выпусках паўкопкаў пакуль не выяўлена. Выкажам меркаванне, што гэта адбылося ў самым канцы 1564 г., а ў самым пачатку наступнага года былі выпушчаны пробныя экзэмпляры 30 грашовіка з датай 1565 г., аднак непасрэдна ў абарачэнне яны не патрапілі, бо, верагодна, ужо былі праблемы з абарачэннем контрмаркіраваных талераў "спадчыны каралевы Боны", якія былі "парытэтны" 60 літоўскім грошам. Насельніцтва не жадала іх прымаць па такому, амаль удвая завышанаму кошту, што вымусіла ўрад даволі хутка прымаць меры па вывадзе іх з абарачэння. Літоўскі талер 1565 г., верагодна, быў першай літоўскай манетай, якая была выпушчана да памятнай даты – юбілея Вялікага князя: у гэтым годзе Жыгімонту Аўгусту споўнілася 45 год – менавіта па-гэтаму на аверсе была змешчана яго выява.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што эмісіі літоўскіх 30 грашовікаў былі ажыццяўлены менавіта ў той перыяд, калі краіна знаходзілася ў вельмі цяжкім эканамічным становішчы і пасля выпуску ў абарачэнне контрмаркіраваных талераў па прымусовым, надзвычай высокім курсе.

На фінансава-грашовым рынку ВКЛ да сярэдзіны XVI ст. не хапала буйной срэбранай манеты. У абарачэнні была і залатая манета, аднак яна выкарыстоўвалася пераважна пры вялікіх разліках. Пры сярэдніх і малых сумах выкарыстоўвалася мелкая манета – паўгрош, грош і пенязь. Талер стаў адносна масавай манетай толькі ў наступным стагоддзі, аднак пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. паступова ўваходзіць у грашовае абарачэнне на мясцовых рынках.

ЛІТАРАТУРА

1. Ulanicki, W. O półkopku litewskim Zygmunta Augusta z 1565 roku / W. Ulanicki. – Warszawa : wyd. B. Bolcewicza, 1897. – 16 s.

2. Gumowski, M. Mennica wileńska w XVI i XVII w. / M. Gumowski. – Warszawa, 1921. – 200 s.
3. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск : Полымя, 1995. – 687 с.
4. Иванаускас, Е. Злоты на польскую стопу – первый литовский талер / Е. Иванаускас // Pieniądz pamiątkowy i okolicznościowy – wspólnota dziejów: Białoruś – Litwa – Łotwa – Polska – Ukraina : materiały z IV Międzynarodowej Konferencji Numizmatycznej, Supraśl, 7–9 IX 2000 / Polskie Towarzystwo Numizmatyczne, Zarząd Główny. – Warszawa, 2000. – S. 59–60.
5. Бектинеев, Ш.И. Денежное обращение на территории Беларуси в IX – XVI веках: нумизматические исследования / Ш.И. Бектинеев. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 509 с.
6. Фенглер, Х. Словарь нумизмата / Х. Фенглер, Г. Гироу, В. Унгер. – М. : Радио и связь, 1982. – 328 с.
7. Акты относящіеся къ исторіи Южной и Западной Россіи. Т. 1 (1361–1598). – СПб. : Тип. Э. Праца, 1863. – 301, 15 с.
8. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 234 (1546–1548). 19-oji Teismų bylų knyga / parengė I. Valikonytė, S. Viskantaitė-Saviščevienė, L. Steponavičienė. – Vilnius : Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2009. – 290 p.
9. Kantecki, K. Summy Neapolitańskie / K. Kantecki // Przewodnik Naukowy i Literacki. Dodatek do “Gazety Lwowskiej”. – 1879. – № 6. – S. 500–514.
10. Zagórski, I. Monety dawnej polski / I. Zagórski. – Warszawa, 1845. – V, 191, XVIII s.
11. Bandtkie, K.W. Numizmatyka krajowa / K.W. Bandtkie. – Warszawa, 1839. – X, 159, IX s.; A-E, 1-35 tabl. T. 1
12. Ryszard, A. Uniwersał króla Zygmunta Augusta z dnia 14 czerwca 1567 roku, według uchwały Sejmu Piotrkowskiego talarom obcym cenę i kurs w Polsce naznaczający: kopia dopełniona i objaśniona / A. Ryszard. – Kraków, 1883. – 19 s.
13. Stronczyński, K. Dawne monety Polskie dynastyi Piastów i Jagiellonów. / K. Stronczyński. – Piotrków : druk. E. Pańskiego, 1885. – Cz. III. – 244 s.
14. Ivanauskas, E. Coins and bars of Lithuania 1236–2012. / E. Ivanauskas. – Kaunas : Kopa, 2013. – T. I. – 600 p.
15. Kurpiewski, J. Katalog monet polskich 1506–1573 / J. Kurpiewski. – Warszawa : Polskie Towarzystwo Numizmatyczne; Zarząd Główny, 1994. – 245 s.
16. Какареко, В.И. Монеты Великого княжества Литовского. 1492–1707 / В.И Какареко, И.Н. Шталенков. – Минск : Экоперспектива, 2005. – 79 с.
17. Волинськi грамоти XVI ст. / упор. В.Б. Задорожний, А.М. Матвiенко. – Киiв : Наукова думка, 1995. – 249 с.
18. Hutten-Czapski, E. Catalogue de la collection des médailles et monnaies polonaises du comte Emeric Hutten-Czapski / E. Hutten-Czapski. – St.-Pétersbourg-Paris : C. Ricker, J. Baer, 1871. – Vol. 1. – 406 s.
19. Abdulskuté, J. Collector Aleksandras Račkus and his lithuanian numizmatics collection in Kaunas M. K. Čiurlionis art museum/ J. Abdulskuté // Rozwój muzealnictwa i kolekcjonerstwa numizmatycznego – dawniej i dziś – na Białorusi, Litwie, w Polsce i Ukraine : materiały z II Międzynarodowej Konferencji Numizmatycznej, Supraśl, 5–7 IX 1996 / Polskie Towarzystwo Numizmatyczne, Zarząd Główny. – Warszawa, 1997. – S. 83–88.
20. Bartynowski, W. Półkopek litewski / W. Bartynowski // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. – 1893. – № 2–3. – S. 68–69.
21. Volumina legum : w 9 t. / Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. – Petersburg : Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859–1860. – T. 2 : Ab anno 1550 ad annum 1609. – 1859. – 482, XIII s.
22. Доўнар-Запольскі, М.В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М.В. Доўнар-Запольскі ; падрыхт. да друку: А.І. Груша, Р.А. Аляхновіч ; увод. арт.: Д.У. Караў, А.У. Унучак, А.І. Груша ; камент.: А.І. Груша, Ш.І. Бекцінееў, Л. Каралюс. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 759 с.
23. Ivanauskas, E. Coins of Lithuania 1386–1707 / E. Ivanauskas, R.J. Douchis. – Vilnius-Columbia : Savastis, 1999. – 272 p.
24. Ivanauskas, E. Coins and bars of Lithuania 1386–2009 / E. Ivanauskas. – Vilnius : Kopa, 2009. – 408 p.

*Пастуnіў 21.10.2015*

## THALERS IN MONEY CIRCULATION OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA BEFORE THE LUBLIN UNION

***A. KARACH***

*The article is devoted to studying the role of the largest silver coin in monetary circulation, up to the end of the 60's of XVI century, in the Grand Duchy of Lithuania. The paper presents updated information on first mention of thaler in local sources. For various reasons, it was difficult for this coin to find its niche in the financial markets of GDL. This article also describes in details the first emissions of Lithuanian thalers, their features and characteristics.*

***Keywords**: GDL, thaler, groat, coin, Sigismund August, monetary circulation, treasure.*